УДК 373.5.016:811.161.3

# МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ РАБОТЫ З ТЭМАЙ «ЛІЧЭБНІК» У 6 КЛАСЕ

***К.А. Марозава*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***В.М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Асаблівасцю лічэбніка з’яўляецца яго прыналежнасць да вуснага маўлення. Важным з’яўляецца тое, што ў адрозненне ад усіх іншых слоў лічэбнікі на нісьме часта перадаюцца лічбамі, а правільна іх чытаць даволі складана. І наадварот, асаблівай увагі патрабуюць арфаграфічныя навыкі, паколькі вучням часам даводзіцца ператвараць лічбавыя запісы ў літарныя.

Мэтазгодна і вельмі карысна для найбольш трывалага засваення лічэбніка ў дадатак да падручніка прапанаваць навучэнцам розныя віды заданняў. Так, напрыклад, пры фарміраванні паняцця пра лічэбнік як часціну мовы асноўныя асаблівасці лічэбніка могуць быць раскрытыя пры дапамозе 1) канкрэтных пытанняў, адказваючы на якія вучні вымушаныя будаваць сказы з выкарыстаннем розных лічэбнікаў у розных склонах і ў ролі розных членаў сказа; 2) заданняў на фарміраваннс ўменне адрозніваць лічэбнікі, назоўнікі і прыметнікі з колькасным значэннем; называць асобныя разрады лічэбнікаў і інш. [1].

Як справядліва лічаць многія настаўнікі, значную ўвагу пры вывучэнні лічэбніка варта надаваць фарміраванню навыкаў правільнага скланення лічэбніка, а таксама асаблівасцям спалучэння лічэбнікаў з назоўнікамі. Пры арганізацыі працы над зборнымі лічэбнікамі варта ўлічваць, што яны выказваюць адценне сумеснасці і маюць абмежаванні ў спалучэнні з назоўнікамі. Вучням трэба паказаць таксама граматычнае падабенства парадкавых лічэбнікаў з аднюснымі прыметнікамі і іх словаўтваральнай сувяззю з колькаснымі лічэбнікамі. Вывучэнне лічэбніка можна паспяхова звязаць з працай па фразеалогіі, паколькі беларуская мова багатая на выразы, асноўным кампанентам якіх з’яўляюцца лічэбнікі.

Практыка паказала, што лічэбнік з’яўляецца складанай часцінай мовы, якая патрабуе пастаяннай трэніроўкі. Часу, адведзенага праграмай, відавочна недастаткова, каб вырашыць усе пастаўленыя задачы і сфарміраваць неабходныя ўменні і навыкі. І таму, улічваючы цяжкасці марфолага-сінтаксічнай структуры лічэбнікаў, ім варта надаваць асобую ўвагу ў працэсе школьнай адукацыі.

## Літаратура

1. **Кавалевіч, З. М.** Вывучэнне лічэбніка ў школе / З. М. Кавалевіч. – Мінск : Народная асвета, 2000. – 144 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова